
ГОРЕЦКИЙ ВЫБОР

Общественная газета

№2 (58)

Январь 2009г.

Горки без горки


Фото из архива

Отшумели новогодние праздники и вот уже коммунальники приехали на площадь перед райисполкомом, чтобы свернуть гирлянды и убрать елку. Выглядело бы это вполне естественно, если бы вместе с праздничными атрибутами с площади не исчезли и детские горки – место скопления и времяпровождения ребятни не только из окружающего микрорайона, но, пожалуй, и со всего города.

В последние дни в редакцию обратился не один наш читатель с недоуменным вопросом: зачем? Зима нынче хоть куда – ни тебе сибирских морозов, ни английской слякоти. Самое время оторвать детишек от компьютерных «стрелялок» и вытащить на свежий воздух. Ан нет, пришло в чью-то неумную голову дать команду горку с площади убрать.

Мы пробовали было выяснить, откуда пришло такое распоряжение, но в коммунально-исполкомовских дебрях как всегда «Иван кивает на Петра», а посему автора установить не удалось. Кое-кто из работников этих структур (в основном те, у кого свои дети-школьники, и кто живет неподалеку) объяснял логику своего начальства соображениями безопасности. Дескать, убрано ограждение, потому и горку пришлось увезти. Подобные аргументы с точки зрения разумного человека не выдерживают никакой критики. Ограждение что – само улетучилось? Надо было не убирать, и вся проблема. Да и практика обваловки площади снегом, которого нынче навыпадало сколько угодно, давно уже доказала свою эффективность.

Что касается заботы о безопасности, то никто не спорит – дело это, конечно же, нужное. Однако, ежели чем и отличаются некоторые наши начальники от нормальных людей, то это умением превратить любое хорошее начинание сначала в психоз, а затем в противоположность изначальной идее. Коль и дальше следовать их логике, то детей теперь не следует выпускать из домов вообще – как бы чего не вышло. Ведь закрыть, разогнать, и затем «умыть руки» гораздо проще, чем действительно заниматься обеспечением той самой безопасности.

Кстати, тем, кто очень уж хочет покататься, подскажем по секрету – такая же горка стоит на городском стадионе. А еще там есть прокат коньков, лыж, и прочего инвентаря. И все это действует – сторонники кладбищенского порядка туда пока еще не добрались.

Эдуард БРОКАРЕВ

На всякий случай.

Когда материал был готов к печати, в Горках наступила оттепель. Однако ссылки на эту “приятную неожиданность” редакция не принимает - впереди февраль.

Антыядзерны лікбез у Астраўцы

Кіраўнік мясцовай антыядзернай ініцыятывы “Астравецкая АЭС – гэта злачынства!” Іван Крук 17 студзеня арганізаваў круглы стол з удзелам запрошаных экспертаў і мясцовых жыхароў.

У працы круглага стала прынялі удзел каля дваццаці жыхароў Астраўца і дзесяць чалавек з іншых рэгіёнаў. У якасці экспертаў выступілі Андрэй Ажароўскі (“Экозащита”, Расія), прафесар Георгій Лепін (“Вучоныя за без'ядзерную Беларусь”), сябра Антыядзернай кампаніі, актывіст Руху “За Свабоду” Юрась Меляшкевіч.

Таксама былі запрошаныя прадстаўнікі “Горацкай антыядзернай групы” (кіраўнік ініцыятывы Пятро Маланачкін, прэс-сакратар Эдуард Брокараў і іншыя), Таццяна Новікава (“Зялёны Партал”), прадстаўнік “Антыатамнага супрацоўлення” Уладзімір Валодзін, кіраўнік Мінскай гарадской арганізацыі Таварыства аховы помнікаў – Зміцер Каспяровіч, прадстаўнік маладзёвай арганізацыі “Вольная моладзь” Андрэй Зубараў і іншыя.

Пасля выступаў экспертаў адбылося абмеркаванне сітуацыі ў Астраўцы. Як вядома, астравецкая пляцоўка абраная беларускімі ўладамі для будаўніцтва АЭС. Рашэнне пра пабудову станцыі прымалася без уліку меркавання мясцовых жыхароў і без грамадзкага абмеркавання.

– Былі выказаны прапановы аб планах па дзейнасці ў бліжэйшы час, абмяркоўваліся прыярытэтныя накірункі працы і магчымыя шляхі для дапамогі астравецкім актывістам антыядзернай кампаніі. Вырашана сканцэнтравацца на збору подпісаў сярод мясцовых жыхароў і інфармацыйнай працы, – распавядае Юрась Меляшкевіч.

Па словах актывіста Руху, мерапрыемства прайшло на высокім узроўні. Астраўчане паказалі сябе як добрыя арганізатары, таму ёсць надзея, што кампанія будзе не менш паспяховай, як у Горках.

milinkevich.org

Тут і цяпер

Сьмех і грэх

Калгас спужаўся студэнта

Студэнт пятага курсу гарадзенскага Аграрнага ўнівэрсытэту Алег Пронскі днямі быў выкліканы на гутарку да першага прарэктара ВНУ Аляксандра Дудука.

Той параіў студэнту адмовіцца ад грамадзкай дзейнасьці, інакш гаспадарка, у якую ён зьбіраецца на працу, можа адмовіцца ад яго, і хлопца могуць пераразьмеркаваць у Гомельскую вобласьць. Пра гэта паведаміў рэгіянальны каардынатар руху "За свабоду" Алесь Зарамбюк.

Алег Пронскі вучыцца на пятым курсе. Ён удзельнік руху "За свабоду", каардынатар кампаніі "За эўрапейскую Мастоўшчыну" ў сваім родным Мастоўскім раёне.

Сяргей Астраўцоў

Паважаныя землякі. У любым грамадзтве ёсць людзі, якія хочуць памяняць да лепшага не толькі асабістае жыццё, але зрабіць больш справядлівай і нашу агульную долю. Гэтыя людзі не даюць спаць спакойна ніякай уладзе - ні царскай, ні дэмакратычнай. З імі ня проста. Яны заўжды маюць аргументаваную прадуманую пазіцыю. Таму і банальна "заткнуць рот" ім не можа нават уладнае чынавенства. Я мяркую, кожны з нас можа ўзгадаць такога знаёмага ці сваяка "праўдаруба".

Далёка не заўжды "праўдашукальнікі" маюць рацыю і не заўсёды іх дзейнасць прыносіць плён... Але менавіта такія людзі з'яўляюцца "дражджамі"для новых грамадцкіх ідэй і спраў, а па-добраму - рухавікамі разьвіцця любой паспяховай краіны. Нажаль, у нас чалавека такога складу ўжо багата гадоў цкуюць, гоняць адусюль па прынцыпе: сабака брэша, а караван ідзе. Куды зайшоў у рэшце рэшт наш "караван – Беларусь" апошнім часам зразумелі многія... Колькі гадоў незалежныя ад уладаў спецыялісты білі ў званы: людзі! Куды мы ідзем! Азірніцеся праўдзе ў вочы! На "версе" сьмяяліся, а народ маўчаў: дасць Бог, пранясе. Не пранясло... Але, я упэўнены, галоўнае сёньня не хто быў правы, хто вінаваты, а хутчэй, адкінуўшы старыя крыўды разам ратавацца. Бо час не чакае і ўжо заўтра можам трапіць у такую яму, выбірацца з якой прыйдзецца марудна і доўга. Першым крокам такой супольнай дзейнасці я бачу стварэньне ў кожным раёне антыкрызісных камісій з удзелам прадстаўнікоў улады і незалежных прафесіяналаў. Гэта дазволіць прымаць лепш прааналізаваныя і ,значыць, больш эфектыўныя рашэньні. Стварыць план дзеянняў на выпадак рэзкага (у два-тры разы) зніжэння паступленняў грошай у бюджэт. У гэтым плане прадугледзець сродкі на выплаты тым, каму падчас крызісу цяжэй за ўсіх: мацярам з дзецьмі да трох гадоў, інвалідам, студэнтам, пенсіянерам. Звярнуцца да ўраду з прапановай вярнуць ільготы гэтым катэгорыям насельніцтва. Спыніць авантуру па будаўніцтву АЭС і накіраваць запланаваны на яе бюджэт на падтрымку нацыянальнай валюты і годнага ўзроўня заробкаў. Забяспечыць бесплатным харчаваннем дзіцячыя садкі і школы і г.д.

Апаненты скажуць: чаго бегчы наперадзе цягніка? Няхай " на версе" ламаюць галовы, што і як рабіць, ім адтуль відней. Але, паважаныя землякі, крызіс да нас прыйшоў менавіта ад таго, што доўгія гады ўсе грамадзкія рашэнні прымаліся за нас і не намі. І калі, крый Божа, сапраўды спраўдзяцца горшыя прагнозы экспертаў, дык вырашаць нашы праблемы прыйдзецца нам самім. Разам. Тут і цяпер.

Андрэй Юркоў

Беларусь 167-я паводле індэксу эканамічнай свабоды

Сёлета Беларусь заняла 167-е месца ў рэйтынгу эканамічнай свабоды, які з 1995 года вызначаюць амэрыканскі дасьледчы фонд "Heritage Foundation" і газэта "The Wall Street Journal". Сёлетні рэйтынг Беларусі – найгоршы за ўсе папярэднія гады.

Індэкс эканамічнай свабоды параўноўвае ўмовы для эканамічнага разьвіцьця ў 179 краінах сьвету.

У рэйтынгу краіны ацэньваюцца паводле 10 паказьнікаў, якія адлюстроўваюць розныя аспэкты эканамічнага жыцьця: свабоду прадпрымальніцтва, гандаль, падатковую сыстэму, урадавыя выдаткі, цэнавую палітыку, свабоду інвэстыцый, банкаўскую сыстэму, гарантаванасьць прыватнай уласнасьці ад пасяганьняў дзяржавы, узровень карупцыі ў эканоміцы, рынак працы. Кожны з гэтых паказьнікаў, як і агульны індэкс эканамічнай свабоды, вымяраецца паводле стобальнай шкалы — 100 балаў адпавядаюць максымуму свабоды, 0 — мінімуму.

Мэтадалёгія вызначэньня гэтых паказьнікаў пададзеная на сайце http://www.heritage.org/. Вылічэньні, якія ўжываюцца дзеля вызначэньня індэксу эканамічнай свабоды, даволі элемэнтарныя і даступныя для чалавека з базавай матэматычнай адукацыяй.

Сёлета Беларусь атрымала агульную ацэнку **45 балаў**, што дало ёй апошняе месца сярод эўрапейскіх краінаў. Дый сярод постсавецкіх краінаў горшае за Беларусь месца заняў толькі Туркмэністан –169-е, агульная ацэнка 44,2 бала.

А вось якія месцы занялі некаторыя постсавецкія краіны: Эстонія –13-е, Армэнія –31, Кыргызстан –74, Малдова –120, Расея –146, Украіна –152. Найбольш свабодная эканоміка, паводле "Heritage Foundation" і "The Wall Street Journal", існуе ў Ганконгу (90 балаў), потым у Сынгапуры (87,1) і Аўстраліі (82,6).


Найвышэйшы індэкс эканамічнай свабоды ў Эўропе мае Ірляндыя (82,2), якая заняла 4-е месца ў гэтым рэйтынгу. Рэйтынг замыкаюць эканомікі Кубы, Зімбабвэ і Паўночнай Карэі.

Сёлетняя публікацыя індэксу эканамічнай свабоды суправаджаецца некалькімі артыкуламі экспэртаў "Heritage Foundation" і "The Wall Street Journal", якія, аналізуючы 15-гадовую практыку вылічэньня гэтых індэксаў, робяць некаторыя агульныя сацыяльна-эканамічныя высновы.

Паводле **Тэры Мілера**, чым вышэйшы індэкс эканамічнай свабоды ў краіне, тым большая імавернасьць, што краіна ўтрымае эканамічны рост і паменшыць беднасьць насельніцтва. А паводле **Стывэна Мура**, утрыманьне эканамічнага росту і дасягненьне заможнасьці — найбольш імаверныя тады, калі кіраўніцтва краіны ў змозе захаваць нізкія падаткі, утрымаць стабільную валюту, абмежаваць уплыў чыноўнікаў на эканоміку, гарантаваць надзейную ахову прыватнай уласнасьці, адкрыць краіну для глябальнага рынку і фінансавых патокаў ды праводзіць "разумнае рэгуляваньне" эканомікі.

Милинкевич пойдет на выборы

Если не увидит более сильного кандидата



Александр Милинкевич намерен участвовать в качестве кандидата в ближайших президентских выборах, которые должны состояться не позднее 8 февраля 2011 года.

«Я собираюсь идти на выборы, но если увижу достойного кандидата, который пользуется поддержкой у населения и имеет шансы победить, стану с ним рядом и буду работать на него», — заявил лидер движения «За свободу» 14 января на пресс-конференции в Минске.

Милинкевич поставил под сомнение вероятность выбора единого кандидата от оппозиции. «Часть оппозиции может не поддержать идею независимости Беларуси от России, может выступить за создание союзного государства, но иными методами, чем сегодняшние власти», — предположил политик.

В рамках союзного государства с Россией независимость Беларуси невозможна, считает Милинкевич. «Беларусь и Россия — разноплановые страны с разными территориями, экономикой», — пояснил он. Проект создания союзного государства политик считает «идеологическим, мифологизированным, нереальным, не отвечающим интересам белорусского народа».

Вместе с тем Милинкевич выступает за дружественные отношения с Россией: «Мы должны учитывать интересы России, но только в том случае, если они не противоречат интересам Беларуси». Беларусь «обладает достаточным потенциалом, чтобы быть независимой».

Заместитель председателя движения «За свободу» Виктор Корнеенко, в свою очередь, отметил, что единый кандидат от оппозиции «должен показать свою силу в обществе, что он известен в Беларуси и за него готовы голосовать». Корнеенко также полагает, что оппозиция, вероятнее всего, «своевременно не решит вопрос избрания единого кандидата».

«В Объединенных демократических силах некоторые сопредседатели снимают вопрос об избрании единого кандидата, они просто не готовы сейчас его обсуждать», — подчеркнул Корнеенко. Он также сообщил, что движение «За свободу» будет «активно работать над созданием инициативной группы Александра Милинкевича».

По мнению Милинкевича, «существенную роль в выборах» в Беларуси сыграет Россия. «Возможен треугольник кандидатов: представители демсил, номенклатуры (например, Александр Лукашенко) и России. Россия вряд ли будет поддерживать сегодняшние белорусские власти», — считает политик.

«Мы не конфликтуем с другими оппозиционными структурами, — заявил Александр Милинкевич. — Мы считаем их партнерами, а не соперниками».

По его словам, движение «За свободу» является частью Объединенных демократических сил. «Мы будем участвовать в деятельности этой структуры в той части, которая соответствует нашим целям и ценностям», — сказал Милинкевич.

Вместе с тем, отметил политик, организация, которую он возглавляет, отличается от политических партий. «Движение «За свободу» создавалось для сотрудничества широкого круга людей. У нас нет строгой дисциплины, мы помогаем людям в самоорганизации», — пояснил Милинкевич. Он также сообщил, что около 80% членов движения не входят в состав политических партий.

«За свободу» готово сотрудничать с властями «по некоторым вопросам», заявил Милинкевич. «Мы не заявляем, что являемся оппонентами властей по всем вопросам. По некоторым из них мы готовы сотрудничать», — сказал он.

Политик отметил, что одной из целей движения является европеизация Беларуси. «Сейчас шаги по европеизации также декларируются властями. Если власть принимает правильные решения, которые приносят пользу Беларуси, то мы их будем только приветствовать», — заявил Милинкевич.

По его словам, власти сделали несколько шагов по либерализации общества. «Конечно, необходимо сказать, что эти шаги были вынужденными, так как кризис в Беларуси, и не только экономический, существует уже давно. Но эти шаги не только вынужденные, но и позитивные», — считает политик.

Он сообщил, что в рамках движения будут разрабатываться программы реформирования разных сфер жизни общества. «Теперь такое время, когда наши предложения могут быть не только теоретическими, но и используемыми властями», — сказал Милинкевич.

По мнению политика, Европа должна делать некоторые шаги навстречу руководству Беларуси, однако они «не должны касаться принципиальных вопросов».

«Я думаю, несмотря на то, что движение «За свободу» долгое время не было зарегистрировано, мы свою деятельность не прекращали, а работали, — подчеркнул А.Милинкевич. — Сделано довольно много, и я думаю, наша заслуга в том, что акции, мероприятия, интересные события были не только в Минске, но и в регионах».

По словам политика, движение «За свободу» позиционирует себя как сеть сотрудничества, координации и самоорганизации: «Мы приглашаем к нам тех людей, которые хотят действовать в рамках нашей стратегии и разделяют наши цели. А цели просты — демократизация Беларуси и путь в Европу».

«Я думаю, то, что движение «За свободу» наконец зарегистрировали, логично и соответствует закону и Конституции. Для нас это важно, и мы надеемся, что это расширит круг наших приверженцев, тех людей, которые с нами работают, будет меньше страха сотрудничать с легальной организацией. Я считаю, что мы расширим и нашу деятельность. Очень бы хотелось кроме информирования, образования также больше заниматься проектами в сфере культуры. Мы не партия, но мы не будем избегать участия в политических акциях, потому что видим в этом свой долг», — добавил лидер движения.

Сергей КОРОЛЕВИЧ

За отсутствие инвестиций чиновники ответят «персонально»

В Беларуси государственные чиновники отныне за выполнение инвестиционных проектов будут нести персональную ответственность.

За своевременную реализацию в 2009-2010 годах 115 инвестиционных проектов, которые осуществляются по решению белорусского правителя, правительства, а также местных органов власти, руководители госорганизаций будут в Беларуси теперь отвечать персонально. Это предусмотрено новым постановлением Совета министров. Относительно того, способна ли данная мера повлиять на успех самих проектов, мнения экспертов разошлись, передает «Немецкая волна».

Чтобы не сидели, сложа руки

Как объясняют разработчики документа, введение института персональной ответственности направлено на ускорение реализации инвестиционных проектов, активизацию работы ответственных лиц - чтобы те не сидели, сложа руки, ожидая действий инвестора.

До сих пор персональная ответственность за реализацию того или иного проекта устанавливалась лишь в случае заключения инвестиционного договора непосредственно с Республикой Беларусь.

Однако не по всем перечисленным в постановлении правительства проектам были заключены такие договоры. Теперь же чиновники должны до 20 февраля разработать и утвердить графики реализации инвестпроектов, чтобы потом ежемесячно и ежеквартально отчитываться в том, как идет их исполнение.

Если нельзя иначе

Независимый экономист Василий Шлындиков считает, что персональная ответственность способна заставить шевелиться госчиновников.

По мнению Шлындикова, если других инструментов не остается, то, не исключено, новая мера окажется эффективной, тем более, что она, по выражению экономиста, соответствует белорусской специфике.

«Эта система по-другому работать не может. Ее суть - кнутом, тюрьмой заставит чиновников работать», - подчеркнул Шлындиков.

Экалягічны каляндар ад Валера Дранчука

Адзін зь лідэраў беларускіх "зялёных", кіраўнік грамадзянскай ініцыятывы "TERRA-Канвенцыя" Валер Дранчук. Сёньня спадар Валер знаёміць слухачоў" Свабоды" зь беларускім экалягічным календаром.

Наперадзе цэлы год і сёньня я хачу пазнаёміць слухачоў "Свабоды" зь некаторымі датамі экалягічнага календара. Справа, лічу, гэта ня марная і не такая дзяжурная, як можа падацца. Хоць бы таму, што ў гэтыя дні, пазначаныя на ўсясьветна-міжнародных скрыжалях зялёным колерам, лягчэй знайсьці і прыдатную нагоду: каму – для трыюмфальных службовых справаздачаў, каму – для грамадзянскіх пратэстаў.

У нашай краіне, далёка не лагоднай да іншадумства, такія пратэсты як бы зьлёгку легалізуюцца, і ў кожным асобным выпадку дата як бы дадае магчымасьцяў заявіць пра свае правы на здаровае чыстае асяродзьдзе ў блізкім краявідзе паўней ды галасьней. Выбар тут шырокі: ад арганізацыі пікета ці шэсьця да напісаньня блогу, звароту, гучнай заявы.

Вось, напрыклад, зусім неўзабаве, **2 лютага** – Усясьветны дзень водна-балотных угодзьдзяў. Маючы адпаведны сантымэнт ці грамадзянскую пазыцыю, можна ўжо сёньня пачынаць падрыхтоўку. А ў **сакавіку, 22-га** дня, – усясьветны дзень водных рэсурсаў. Душа так і просіць адзначыць гэты дзень удзячна, парадавацца, адказаць на выклікі, акунуцца ў чыстую палонку. У гэтым жа месяцы – **30 сакавіка** – Дзень абароны Зямлі, а літаральна праз дзень – **1 красавіка** – сьвет ушаноўвае птушак.

А вось дзень чарнобыльскай трагедыі – паводле беларускага календара, **26 красавіка**, у сьвеце адзначаецца як Дзень памяці загінулых у радыяцыйных аварыях і катастрофах. Бадай, самы блізкі да нашай тэмы – Міжнародны дзень біялягічнай разнастайнасьці, які адзначаецца **22 траўня**. Хочацца спадзявацца, што гэты дзень ня стане для нашых нашчадкаў сьвятам-успамінам...

Тут, на травеньскім улоньні, я перапынюся, бо на ўсе даты бракуе часу, і буду прасіць "Свабоду", каб дні, у якія свет пазыцыянуе стаўленьне да прыродных каштоўнасьцяў, навакольнага асяродзьдзя, затрымаліся на сайце асобнай калёнкай і кожны з наведнікаў мог іх раздрукаваць ды па магчымасьці распаўсюдзіць.

Я вось што яшчэ падумаў: было б зусім няблага разьмеркаваць даты экалягічнага календара паміж вядомых аўтарытэтных людзей, грамадзкіх дзеячоў, прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасьці: якая бліжэй твайму сэрцу, за тую і бярыся, змагайся, адстойвай, вядзі за сабой – дапамажы прыродзе і блізкаму краявіду!

2 лютага — Усясьветны дзень водна-балотных угодзьдзяў
22 сакавіка — Усясьветны дзень водных рэсурсаў
23 сакавіка — Усясьветны метэаралягічны дзень
30 сакавіка — Дзень абароны Зямлі
1 красавіка — Міжнародны дзень птушак
1 красавіка — Дзень геолага
7 красавіка — Усясьветны дзень здароўя
22 красавіка — Дзень Зямлі
26 красавіка — Дзень памяці загіблых у радыяцыйных аварыях і катастрофах
22 траўня — Міжнародны дзень біялагічнай разнастайнасьці
31 траўня — Усясьветны дзень без тытуню
5 чэрвеня — Усясьветны дзень навакольнага асяродзьдзя
8 чэрвеня — Дзень абароны акіянаў
17 чэрвеня — Усясьветны дзень барацьбы з апустэльваньнем і засухай
6 жніўня — Усясьветны дзень дзеяньняў за забарону ядзернай зброі
16 верасьня — Міжнародны дзень аховы азонавага слою
27 верасьня — Міжнародны дзень турызму
28 верасьня — Усясьветны дзень мора
4 кастрычніка — Усясьветны дзень жывёлаў
10 кастрычніка — Міжнародны дзень па зьмяншэньні небясьпекі стыхійных бедстваў

«ГОРЕЦКИЙ ВЫБОР»
Общественная газета. № 2(58), январь 2009г.
Издатель и главный редактор - ЭДУАРД БРОКАРЕВ. Brok61@yandex.ru Т. 545 89 83.
Издание непериодическое, выходит по мере возможности. Тираж 299 экземпляров.
Редакция самостоятельно принимает решения о размещении бесплатной социальной рекламы.
Редакция использует материалы сайтов: svaboda.org/ milinkevich.org/ racyja.com/ naviny.by/ pbnf.org/ belsat.eu/ horki.info/ charter97.org/ belradio.fm/